# СТЫПЕНДЫЯЛЬНАЯ ПРАГРАМА

# УРАДУ РЭСПУБЛІКІ ПОЛЬШЧА

# імя КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА

## ПАД ПАТРАНАТАМ СТАРШЫНІ РАДЫ МІНІСТРАЎ РП

## V Выпуск Праграмы на акадэмічны год 2010/2011

Падставай стварэньня Праграмы зьяўляецца „Ліст намераў", падпісаны 30 сакавіка 2006 году ў Актавай залі ім. Адама Міцкевіча ў Варшаўскім унівэрсітэце Старшынём Рады Міністраў РП сп. Казімежам Марцінкевічам, сп. Аляксандрам Мілінкевічам прадстаўніком Аб'яднаных дэмакратычных сіл у Беларусі ды прадстаўнікамі Канфэрэнцыі Рэктараў польскіх акадэмічных школ (KRASP) і Канфэрэнцыі Рэктараў польскіх унівэрсытэтаў (KRUP), у прысутнасьці некалькісот студэнтаў, навуковых супрацоўнікаў і гасьцей, сабраных на гэтай урачыстасьці.

У I годзе дзейнасьці Праграмы, у ліпені 2006 году, былі прынятыя 244 особы, якія пачалі вучобу на 77 розных напрамках у 37 вышэйшых навучальных установах у 15 гарадох цэлай Польшчы.

У II годзе дзейнасьці Праграмы, у верасьні 2007 году, была прынята 71 особа. У выпуску Праграмы 2007/2008 г. прынятых студэнтаў накіравалі ў 15 гарадоў, на 23 вышэйшыя навучальныя ўстановы, дзе яны пачалі вучобу на 24 розных навучальных напрамках.

У III годзе дзейнасьці Праграмы, у верасьні 2008 году, было прынята 58 особаў. У выпуску Праграмы 2008/2009 г. прынятых студэнтаў накіравалі ў 11 гарадоў, на 22 вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія пачалі вучобу на 24 розных навучальных напрамках.

У IV годзе дзейнасьці Праграмы, у верасьні 2009 году, было прынята 44 особы. Удзельнікаў накіравалі ў 14 гарадоў, на 22 вышэйшыя навучальныя ўстановы, дзе яны пачалі вучобу на 26 розных навучальных напрамках.

KOORDYNATOR PROGRAMU

STUDIUM EUROPY WSCHODNIEJ UNIWERSYTET WARSZAWSKI

BIURO PROGRAMU:

Pałac Potockich, Krakowskie Przedmieście 26/28, 00-927 Warszawa

Tel. +48-22 55 21 888; fax +48-22 55 21 887; e-mail: bialorus.studium@uw.edu.pl; www.studium.uw.edu.pl

## I. ПРАВІЛЫ ПРАГРАМЫ

1. Стыпэндыяльная праграма носіць імя Кастуся Каліноўскага (нар. у 1838 г.), студзеньскага паўстанца, упаўнаважанага паўстанцкага ўраду ў Вялікім Княстве Літоўскім, павешанага ў Вільні (у 1864 г.), заслужанага таксама для абароны беларускай нацыянальнасьці й культуры, памяць пра якога вечна жывая сярод беларусаў.
2. Мэта праграмы стварыць адукацыйныя шанцы тым студэнтам зь Беларусі, якія страцілі магчымасьць вучыцца ў беларускіх вышэйшых навучальных установах па палітычных прычынах. Яны маюць магчымасьць закончыць вучобу ў Польшчы, альбо працягваць вучыцца тут да часу, калі змогуць вярнуцца ў свае ВНУ на Бацькаўшчыне.
3. Урад Польшчы запэўніць адпаведныя сродкі на стыпэндыі для студэнтаў зь Беларусі, а польскія вышэйшыя навучальныя ўстановы, згуртаваныя ў Канфэрэнцыі Рэктараў польскіх унівэрсытэтаў (KRUP), у Канфэрэнцыі Рэктараў польскіх акадэмічных школ (KRASP) ды астатнія ВНУ, якія бяруць удзел у Стыпэндыяльнай праграме імя Кастуся Каліноўскага, забясьпечаць навукова-дыдактычныя ўмовы для правядзеньня вучэбнага працэсу.
4. Стыпэндыяльная праграма будзе рэалізоўвацца ў супрацоўніцтве зь Міністэрствам замежных справаў і Міністэрствам навукі й вышэйшай адукацыі РП.
5. Пры Варшаўскім унівэрсітэце ў 2006 г. было створана Праграмнае бюро, задачай якога зьяўляецца падрыхтоўка дакумэнтацыі кандыдатаў на вучобу, апрацоўка заяваў ВНУ, якія прымаюць удзел у Праграме, забесьпячэньне Падрыхтоўчага курсу (у вакацыйны пэрыяд перад вучобай) ды каардынацыя апекі над стыпэндыятамі Праграмы пасьля разьмяшчэньня іх у ВНУ.
6. Дырэктарам і каардынатарам „Стыпэндыяльнай праграмы ім. Кастуся Каліноўскага”, які кіруе працай бюро й працай камісій, кваліфікуючых кандыдатаў на вучобу, зьяўляецца загадчык Студыюму Ўсходняй Эўропы Варшаўскага ўнівэрсытэту.

## II. КАНДЫДАТЫ

1. Удзельнікамі Праграмы могуць быць студэнты й асьпіранты беларускіх вышэйшых навучальных установаў, якія былі адлічаныя з ВНУ па палітычных прычынах, альбо якім па палітычных прычынах не дазволілі распачаць ці працягваць вучобу ў Беларусі. Апрача гэтага ў Праграме могуць старацца прыняць удзел дзеці бацькоў, рэпрэсаваных па палітычных прычынах.
2. Валоданьне польскай мовай не зьяўляецца варункам атрыманьня стыпэндыі, але пажадана, таксама валоданьне ангельскай мовай. Стыпэндыяльная праграма імя Кастуся Каліноўскага сарганізуе для прынятых асобаў курсы навучаньня польскай мовы ў рамках Падрыхтоўчага курсу.
3. Кваліфікацыю кандыдатаў, у рамках дзейнасьці Праграмнага бюро, правядзе Камісія, пакліканая дзеля гэтай мэты Дырэктарам праграмы. Камісія будзе вырашаць пра прыняцьцё кандыдатаў пасьля азнаямленьня з ацэнкай Камітэту абароны рэпрэсаваных (HKAR), абапіраючыся на прынцыпы дзейнасьці Праграмы.
4. Прыняцьце ў Праграму, а таксама разьмеркаваньне стыпэндыятаў па польскіх ВНУ зьдзейсьніць Дырэктар праграмы, абапіраючыся на заявы ВНУ й беручы пад увагу перш за ўсё магчымасьць працягу вучобы згодна з напрамкам, распачатым у Беларусі.

5. Магчымы набор у мэдычныя ВНУ, а асабліва ў мастацкія, будзе патрабаваць дадатковага пацьвярджэньня магчымасьці набору ў дадзеным годзе, а таксама праверкі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі прафэсійных кваліфікацыяў. У выпадку аплікацыі ў вышэй згаданыя ВНУ кандыдат будзе прыняты на Праграму толькі пасьля заліэчньня яго ў сьпіс студэнтаў дадзенай ВНУ, пасьля выкананьня ўсіх патрабаваньняў ВНУ.
6. Камісіі альбо асобы, вызначаныя Рэктарамі вышэйшых навучальных установаў (Дэканамі), па якіх будуць разьмеркаваныя студэнты, ужо ў рамках паасобных факультэтаў, інстытутаў правядуць ацэнку праграмных разыходжаньняў і акрэсьляць прынцыпы іх выраўнаньня.

## III. ПАДРЫХТОЎЧЫ КУРС

1. Дзеля падрыхтоўкі закваліфікаваных стыпэндыятаў на вучобу адбудзецца прыблізна двухмесячны Падрыхтоўчы курс. Курс ахопіць: інтэнсіўныя заняткі па польскай мове, а таксама лекцыі й практыкаваньні з галіны культуры й гісторыі Польшчы ды рэгіёну.
2. Апрача гэтага цягам першага навучальнага году стыпэндыяты Праграмы будуць праходзіць абавязковыя лекцыі польскай мовы, аплачаныя стыпэндыятам альбо ВНУ, калі так вынікае зь яе ўнутраных правілаў.

## IV. УМОВЫ СТЫПЭНДЫІ

1. Працяг вучобы будзе залежаць ад таго, на які курс студэнт будзе прыняты ў Польшчы. Максымальна (пры запісаньні на першы курс) вучоба можа працягвацца 5 гадоў.
2. Студэнты будуць вызваленыя ад аплатаў за вучобу ў польскіх ВНУ.
3. Студэнты атрымаюць стыпэндыю ў памеры 1240 злотых у месяц.
4. Стыпэндыят абавязаны заплаціць мэдычнае страхаваньне (каля 40 злотых у месяц) і зьвярнуцца па карту часовага побыту (400 злотых).
5. Вышэйшыя навучальныя ўстановы запрапануюць студэнтам платныя месцы ў інтэрнатах.
6. Падчас прабываньня ў Польшчы студэнты будуць прымаць удзел у сустрэчах, арганізаваных Праграмным бюро, а таксама змогуць атрымаць дапамогу ў разьвіцьці кантактаў з польскімі асяроддзямі ды ўтрымліваць сувязі з калегамі ў Беларусі.

## V. ДАКУМЭНТЫ

1. Запоўненая анкета „Кандыдата праграмы” (даступная на інтэрнэт-старонцы Студыюм Ўсходняй Эўропы: www.studium.uw.edu.pl/kk)
2. Заява на вучобу ў Польшчы
3. Дыплём заканчэньня сярэдняй школы (атэстат сталасьці)
4. Заліковая кніжка з вучобы ў вышэйшай навучальнай установе ў Беларусі
5. Сьпіс залічаных прадметаў
6. Праграма вучобы ў беларускіх ВНУ дзеля вызначэньня праграмных разыходжаньняў
7. Дакумэнт (пасьведчаньне) адлічэньня з ВНУ (калі мела месца)
8. Дакумэнт (пасьведчаньне) арышту альбо прысуду (калі меў месца)
9. Іншыя дакумэнты, якія, меркаваньнем кандыдата, могуць мець значэньне для рашэньня Кваліфікацыйнай камісіі.

## VI. АПЛІКАЦЫІ

1. Кандыдат у Праграму можа прыслаць дакумэнты па пошце, па факсе, альбо прынесьці асабіста ў Праграмнае бюро ў Студыюме Ўсходняй Эўропы Варшаўскага ўнівэрсытэту, а таксама у першую даступную дыпляматычную альбо консульскую пляцоўку Рэспублікі Польшча ў Беларусі.
2. Разглядацца будуць кандыдатуры з унесеным камплектам дакумэнтаў.
3. Брашуры й анкеты будуць даступныя ад **15 траўня 2009 году** ў Праграмным бюро ды на інтэрнэт-старонцы, а таксама ў дыпляматычных і консульскіх пляцоўках РП у Беларусі.
4. Тэрмін прыёму дакумэнтаў канчаецца **20 чэрвеня 2009 году**.
5. Размовы кандыдатаў з камісіяй адбудуцца ў Пасольства Рэспублікі Польшча у перыяд з **21-30 чэрвеня 2010 году**.
6. Да **15 ліпеня 2009 году** адпаведная камісія закваліфікуе кандыдатаў да Падрыхтоўчага курсу „Стыпэндыяльнай праграмы ім. Кастуся Каліноўскага”.
7. Рашэньне аб канчатковым залічэньні на Праграму й накіраваньне ў ВНУ будзе абвешчана да **20 верасьня 2009 году**.

## VII. ПРАГРАМНАЕ БЮРО

1. Бюро Стыпэндыяльнай праграмы ім. Кастуся Каліноўскага знаходзіцца ў Варшаўскім унівэрсытэце пры Студыюме Ўсходняй Эўропы, ul. Oboźna 7, III p., lok. 55 (уваход ад вул. Sewerynów)
2. Кантактныя даныя Праграмнага бюро:
   Tel.: 022 55 21 888, faks: 022 55 21 887,
   e-mail: bialorus.studium@uw.edu.pl;
   інтэрнэт-старонка: www.studium.uw.edu.pl/kk.

KOORDYNATOR PROGRAMU
STUDIUM EUROPY WSCHODNIEJ UNIWERSYTET WARSZAWSKI
BIURO PROGRAMU:
Pałac Potockich, Krakowskie Przedmieście 26/28, 00-927 Warszawa
Tel. +48-22 55 21 888; fax +48-22 55 21 887; e-mail: bialorus.studium@uw.edu.pl; www.studium.uw.edu.pl